ПАГОНЯ

Цэна № 1 аукс.

ГРАМАДЗКАЯ, ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ЧАСОПІСЬ

ВЫХОДЗІЦЬ ЧАСОВА РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цэна за абвесткі:

1 стр. пэтыту на 2 стр.		3 мар.
„ „ „ 1 „		5 „
„ „ у тэксьце		8 „

Адрэс рэдакцыі і канторы:
Вуліца Адама Міцкевіча, 13-а
Тэлефон № 23.

Рэдакцыя адчынена што дзень ад 1—3 гадз.
Кантора адчынена што дзень ад 9—3 гадз.

Падпіска каштуе:

на 10 № № ўпярод	—	10 зал.
„ 5 „ „	—	5 „
Кошт асобнага №	—	1 „

Рукапісы
ня прынятыя да друку назад не вертаюцца; прынятыя аплачаваюцца па пагляду Рэдакцыі.

№ 16. | **Коўна, Панядзелак, 13 сьнежня 1920 г.** | **Год І-шы.**

ГРАМАДЗЯНЕ!

Пастарайцеся ўсімі сіламі і сьродкамі атстаяць дабытыя правы. Ня дайце зьніштожыць іх жадным і захватным палякам.

Падтрымайце, чым толькі можэце, Надзвычайны Заём, ад успеха каторага залежыць Ваша шчасьця.

Абвешчэньне Міністэрства Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці.

Згодна закону Дзяржаўнага Банка за № 490 аб Надзвычайным Займе дзеля патрэб Абароны Краю, Міністэрства Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці гэтым даводзіць да агульнага ведама, што 20 лістапада г. г. ва ўсіх банках і Казначэйствах Літвы—у Коўне, Аліце, Вількавішках, Сэйнах, Лаздзее, Троках, Кашэдарах, Ежэрэнах, Дусятах, Шаўлях, Ракішках, Посволе, Паневежы, Уцянах, Можэйках, Крэцінге, Таўрогэне, Расіенах, Кэйданах, Тэльшах, Вількамі-ры і Марыямполе—пачнецца прадажа Надзвычайнага Займа Дзяржаўнага Банка дзеля патрэб Абароны Краю.

Усе грамадзяне, жадаючыя набыць Надзвычайны Заём Дзяржаўнага Банка дзеля патрэб Абароны Краю, зьвертаюцца самі ці праз сваіх упоўнаважных у бліжэйшыя банкі і Казначэйства, ўносяць грошы (ня менш 50 аўксінаў) і атрымліваюць, па свайму пагляду, імянную ці не імянную квітанцыю з адметкаю ў ёй нумэра прэміі. Усе купляючыя Надзвычайны Заём Дзяржаўнага Банка атрымліваюць процэнты ўперад за тры гады, па 3 аўкс. 60 скат. у год з кожнай соткі, лічучы ад 1 числа наступаючага месяца да 1 сьнежня 1923 года.

Усе грамадзяне, пасьпеўшыя купіць Надзвычайны Заём Дзяржаўнага Банка дзеля патрэб Абароны Краю да Травеня 1921 года, участвуюць у выйгрышы прэміяў, каторыя йдуць у гэткім парадку:

Адзін выйгрыш			100,000 аўкс.
Два „	. . .	па	50,000 „
Дванаццаць „	. . .	„	25,000 „
Пятнаццаць „	. . .	„	10,000 „
Дваццаць „	. . .	„	5,000 „
Сто пяцьдзесят	. . .	„	1,000 „
Тысяча „	. . .	„	500 „
Дзьве тысячы	. . .	„	200 „
Дзьве тысячы	. . .	„	100 „

Усяго выйгрышных нумэроў 5200 на агульную суму 2,000,000 аўксінаў. Кожныя 50 аўксінаў, пазычаныя Дзяржаўнаму Банку, даюць магчымасьць выйграць прэмію аднаго нумэра. Пазычаць могуць усе, хто толькі хоча і на чые захоча імя, ня выключаючы малых і няпоўналетніх.

Ад каго далёка Банк, або хто па якой—небудзь прычыне ня можа зайсьці ў Банк, можна пасдаць грошы па почце; атрымаўшы грошы з бліжэйшай почты, банк зараз жа прышле квітанцыю Надзвычайнага Займа Дзяржаўнага Банка дзеля патрэб Абароны Краю.

Квітанцыі Надзвычайнага Займа прымаюцца ўсімі дзяржаўнымі ўстановамі і банкамі, як залог, а па жаданьню гэтыя-ж квітанцыі банк сапраўляе дарма.

Хто ня мае гатовых грошай, а мае рэквізыцыйныя ордэры ці страціўшыя тэрмін боны Дзяржаўнага Займа, заразжа можа замяніць іх на квітанцыі Надзвычайнага Займа Дзяржаўнага Банка.

Міністэрства Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці спадзеецца, што ўсе грамадзяне і жыхары Літвы нямедля споўняць сваі абавязкі і як найхутчэй будуць купляць Надзвычайны Заём. Квітанцыі Надзвычайнага Займа Дзяржаўнага Банка пачнуць аплачваць 31 сьнежня 1923 года.

Міністр Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці **Гальваноўскі.**

Дырэктар Дэпартамэнту Дзяржаўнага Скарбу **Дульскі.**

Выпіска з пратаколаў паседжэньняў Літоўска-Расейскай Мірнай Дэлегацыі ў Травеню 1920 г. ў Маскве.

Прамова члена Літоўскай Дэлегацыі Дамініка Семашко:

Дэбаты 1-га і 2-га паседжэньняў насілі агульны характар і тым самым далі мне магчымасьць, можа быць, не ў належным яшчэ стопню, выясьніць адносіны Расейскай Дэлегацыі да пытаньня аб граніцах, намечаных Літоўскім Урадам.

Аднак-жа, галоўнае прымечанае мною ў гэтых дэбатах гэта тое, што да гэнага часу ні ў воднай з сваіх прамоў паважаны п. Старшыня Расейскай Дэлегацыі не памянуў ні адным словам аб Беларусі, старанна ўнікаючы самай гэтай назовы. Упорна радзючы Літоўскай Дэлегацыі ня ссылацца на сваі гістарычныя правы, паважаны п. Старшыня Расейскай Дэлегацыі былае Літоўска-Беларускае дзяржаўнае сажыцьцё называе „Русско-Літоўскім", а таму я ўправе прэдпалажыць, што выкасовываючы слова „Бѣлоруссія", Старшыня Расейскай Дэлегацыі намеран выкасаваць гэту назову так сама і з мапы Эўропы. Калі да гэтага часу прэдстаўнікамі „буржуазнага", як назваў п. Старшыня, Літоўскага Гасударства не гаварылося аб беларусах, то гэта не дзеля таго, што яно не савецкае і што яно не „буржуазное" як хоча п. Старшыня, не дзеля таго, а толькі патаму, што Літоўск. Дэлегац. ў сваім складзе мае прэдстаўніка беларускага насяленьня Літвы, прэдстаўленага ўжо п. Старшыне Расейскай Дэлегацыі, якому і прэдстаяў голас у будучыне.

Я не магу не адзначыць так сама таго мамэнту ў аднэй з прамоў паважанага п. Старшыні Расейскай Дэлегацыі, дзе ён выказвае надзею на тое, што народы, быўшыя некалі ў складзе былага Вялікага Князьства Літоўскага, захочуць апрэдэліцца да Савецкай Расеі.

Я не хачу лішаць гэтай надзеі—надзея можа збыцца, а можа і ня збыцца,—гэта справа будучыны. Я хачу указаць толькі на факт разгону Беларускага Кангрэса ў ноч з 17 на 18 сьнежня 1917 г. савецкімі вайскамі ў Менску і на Устаўную Грамату, ад 25 сакавіка 1918 году, агалошаную Беларускай Радай аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

З сказанага мной можна ясна ўбачыць нядображычлівую палітыку Савецкай Расеі ў адносінах да Беларусі і таму я буду лічыць сваім абавязкам прыустанаўленьні граніц абараняць бе[illegible]скія землі на моцы беларуска-літоўскіх сагла[illegible] імпэрыялістычных жаданьняў Поль[illegible] прыуцязаньняў на гэтыя беларуск[illegible] беларускім племем, Савецкай Ра[illegible]ы.

Горадзенская зямля, старо[illegible]скага племені ятвягаў, у сучасн[illegible] рыторыя, заселеная беларускім большасьць насяленьня.

Грамадзянкі Литвы!

Вашы сыны—Літоўскія салдаты—цяпер стаяць на фронце, абараняючы Родную Старонку ад чужаземных разбойнікаў. Яны пераносяць нязьмерны холад, трымаючы аружжо голымі рукамі і стоячы ў мароз на варце. Ад Вас нашы абароннікі чакаюць дапамогі: гатоўце рукавіцы, цёплыя шкарпэткі і пасылайце ў **Камітэт Нацыянальнай Абароны Літвы дзеля адсылкі на фронт.**

Адбыўшыйся 1—3 сьнежня 1918 г. ў м. Городно Беларускі Нацыянальны Кангрэс Городзенскага Краю вынес пастанову аб далучэньні Городзенскай часткі Беларусі да Літвы дзеля абароны ад усё болей і болей выяўляючыхая тэндэнцыяў Польшчы на захват Беластока, Бельска і Городна.

Пастановай гэтага Кангрэссу, на якім былі прэдстаўнікі ад самых далёкіх частак Городзеншчыны, заканчываецца ўзмацненьне права беларусаў працаваць з літоўцамі. Гэта ўзмоцнена яшчэ і тэй абставінай у жыцьці Горадзенскай Беларусі, што 4 красавіка 1919 г. ад Городзеншчыны былі назначаны два прэдстаўнікі—беларусы ў Склад Літоўскай Дзяржаўнай Тарыбы. Гэты факт ужо налажыў вядомыя абавязкі на беларусаў—городзенцаў і выраўняў беларуска-літоўскі фронт проці ўсіх, пасягаючых на гэты самаахвотны многа-векавы прыродны хаўрус двух народаў. Ня лічучы для сябе абавязываючым Брэст-Літоўскі дагавор, куды ня быў дапушчаны прэдстаўнік ад беларусаў, беларусы Літвы ня могуць згодзіцца на прылучэньне паўднёвай часткі Городзеншчыны з местамі—Брэст-Літоўскім, Пружанамі, Кобрынам да Украінскай Народнай Рэспублікі. Самі украінскія рукавадзячыя кругі і Нацыянальны Украінскі Урад цягаціўся, як яны самі заяўлялі, навязанымі ім Брэст-Літоўскім дагаворам беларускімі акрайнамі.

Роль абароны нацыянальных межаў беларускага народу з Польшчай і Украінай, на падставе згоды, па каторай Віленская Беларуская Рада з 20 лістопада 1918 г. стала працаваць разам з Літоўскім Народам,—натуральна бярэ на сябе Літоўскі Урад.

Прамова Старшыні Расейскай Дэлегацыі п. Іоффе:

. . . .

Што датычэ заявы адносна да волі беларускага народу, то нам ведам рад фактаў, маючых надзвычайна сурьёзны стасунак да гэтага так званага самаакрэсьленьня.

Нам ведама, напрыклад, што істнуе гуртокъ, прэтэндуючы на роль Беларускага Ураду, прэтэндуючы на стварэньне незалежнасьці і самастойнасьці Беларусі, прэтэндуючы, у рэшці, на самостойныя перагаворы з Расейскім Урадам. Нам так сама ведама, што ёсьць іншыя гурткі, якія стаяць на паглядзе стварэньня Літоўска-Беларускай Рэспублікі. У рэшці нам ведама, што ёсьць і трэйці гурток і паколькі я магу апэрыраваць тым матарьялам, які ў мяне маецца, вельмі многалічны, які наагул ня хоча выдзеленьня Беларусі са складу Расейскай Сацыялістычнай Фэдэратыўнай Рэспублікі.

Паважаны прэдстаўнік беларускай нацыянальнасьці член Літоўскай Дэлегацыі п. Семашко змаўйгаўся даказаць, што сучасны Расейскі Урад праявіў сваю нядображычлівасьць у адносінах да беларусаў у двох фактах: у тым, што я ні разу ў маіх, меўшых да гэтага месца выступленьнях і прамовах, не упатрэбляў выразы „Бѣлоруссія", а гаварыў аб Расейска-Літоўскім гаспадарстве і гаварыў аб Расеі, а па другое—у факце разгону беларускага кангрэсу ў 1917 г. Калі я не гаварыў да гэтага часу і не гавару цяпер аб Беларусі, то іменна ў віду тых падзеяў, аб якіх я толькі што паведамляў, у віду таго фактычнага становішча, пры якім агромністая масса беларускага насяленьня заяўляла сваю волю астацца ў межах Расеі, а другія часткі гаварылі то аб стварэньні Літоўска-Беларускага Гаспадарства, то аб стварэньні самастойнага Беларускага Гаспадарства. Мы таму ня маем да гэтага часу падстаў лічыць самаакрэсьленьне Беларускага народу адбыўшымся. [illegible] ня маем падстаў лічыць, што як раз [illegible], быць можа, запраўды прэдстаўляе [illegible] Літоўскай дэлегацыі п. Семашко, [illegible]дную волю ўсяго беларускага на[illegible] разгону Беларускага Кангрэсу, [illegible] меў месца, паколькі я [illegible] гэтым пытаньні досьць добра асьведамлен,—бо і гэнэрал Гофман у сваім часе ў Брэсьце апэрыраваў тым-жа матарьялам, якім цяпер апэрыруе п. Семашко, і змагаўся даказаць ня досьць рашучае, ня досьць шчырае праведзеньне намі ў жыцьцё прынцыпу самаакрэсьленьня; такім чынам я лічу, што я даволі добра знаём з фактамі разгону Беларускага Кангрэсу і пазволю сабе пацьвердзіць, што гэта быў кангрэс беларускіх памешчыкаў, разагнаны беларускімі сялянамі. З гэтых фактаў выводзіць нядображычлівасьць стасунку да беларускага народу было-б надзвычайна рызыкоўна.

. . . .

Рэпліка п. Семашко на прамовы членаў Расейскай Дэлегацыі.

Городзенская зямля, як ужо было мною заяўлена, з'яўляецца ў сучасны момант беларускай тэрыторыей. Беларусы, выяўляючыя там агромністую большасьць, гавараць у беларускай мове, называемай у адлічча ад „панской" польскай—„простай", або „мужыцкай". Рэшучым значэньнем з пункту пагляду самаадзначэньня народаў у сучасны момант можа быць толькі воля аднаго беларускага народу, які ўжо самаакрэсьліўся не да Савецкай Расеі і не да Польшчы, а рашыў, як і ўсе народы, дабівацца сваей незалежнасьці.

Але бачучы сябе, дзякуючы то аднэй, то другой, то трэйцяй акупацыі, слабым, каб даць належны адпор імпэрыялістычным жаданьням Польшчы і пасягацельству на сваю незалежнасьць Савецкай Расеі, акрэсьліўся йсьці супольна з Літвой. Па маім данным, надта пэўным, нават гурток, „прэтэндуючы быць Урадам Беларускай Народнай Рэспублікі", як апазваў яго паважаны п. Старшыня, згодзен у сучаны момант з вырэшэньнем Радаў Віленшчыны і Городзеншчыны. Умовы, на якіх гэтыя землі далучаюцца да Літвы, носяць унутраны характар, асновааны на беларуска-літоўскіх паразуменьнях.

Мне прыходзіцца гаварыць толькі аб унешніх граніцах. Гістарычная ссылка Літоўскай Дэлегацыі на тое, што ўся Городзенская зямля належала да Літвы, узмацняе толькі волю беларускага народу, у якім яшчэ не замерло пачуцьцё прыналежнасьці да Літоўскага-Беларускага Гаспадарства.

Выходзячы з эканамічных думак, указаныя ў межах Літвы беларускія часткі, ўжо па свайму геаграфічнаму становішчу з'яўляюцца прыбалтыцкімі краямі, і ўсе рэкі, чыгункі, а роўна і шосы цягнуць да Балтыцкага мора. Адрываючы гэтыя часткі ад Літвы і далучаючы іх да Расеі ці да Польшчы, гэткія ахвяруюцца на многія вякі стаць краем эканамічна не разьвітым, ад каторага карысьці ні Расеі, ні Польшчы, ні самой Беларусі і наагул ніякай карысьці нікому ня будзе.

Што датычэ паўднёвай часткі Горадзенскага краю, дык крэпасьць Брэст у руках мацнейшага суседняга гаспадарства будзе служыць крэпасьцю нападу, тагды як у руках слабейшага Літоўскага Гаспадарства гэта крэпасьць з'яўляецца толькі пунктам абароны ўсяго Городзенскага краю. Я нахожу, што як украінскія рукавадзячыя кругі і Нацыянальны Украінскі Урад, так і Украінская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка, а магчыма й яшчэ які-небудзь няпрэдугледжаны новы Украінскі Урад так сама будзе цягаціцца беларускімі акрайнамі, не маючымі для іх асобнага інтэрэсу.

У прамове, высказанай мною, я указаў на Устаўную Грамату аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, але Расейская Дэлегацыя ні ў якім выпадку ня можа згодзіцца з тым, што ўжо самаадзначыўся і беларускі народ. Натуральнае права незалежнасьці, права чалавечаства, права, на якім будуецца новая сацыялістычная Савецкая Расейская Рэспубліка, у вачах Расейскай Дэлегацыі не прыналежыць да Беларусі.

Я не з'яўляюся тут прэдстаўнікам Беларускай Народнай Рэспублікі, не мая роль тут абараняць інтарэсы гэтага Гаспадарства, але я лічу сваім абавязкам зьвернуць прыхільную ўвагу Расейскай Дэлегацыі, што ня ў ліку справа і ня ў сіле аднаго ці другога гуртка, а ў праваце самага дзела.

Беларусь заўсёды была косьцю раздору між Расеяй і Польшчай, Беларусь і Літва заўсёды жылі між сабой у поўнай згодзе. Літоўскі Урад ніколі не зрачэцца таго, што калі будзе незалежная Беларуская дзяржава і калі інтарэсы Літвы і Беларусі будуць гэтага вымагаць, ён ўступіць у фэдэратыўную сувязь з гэтым гаспадарствам.

Да незалежнасьці Беларусі і вядзе гэны другі гурток, па маім данным, даволі моцны. Як ведама, кангрэс у Менску, аб якім я ўспамянуў, налічваў 1872 дэлегаты ад усіх месцовасьцяў, дзе жыве і мае лічэбную перавагу беларускі народ. Гаваручы аб гэтым гуртку, я павінен падкрэсьліць удзіўляючае для мянэ з'явішча, а іменна: там, дзе маецца ў праграме незалежнасьць Беларускага народу, да якой дэмократычны сялянскі Літоўскі Народ адносіцца дображычліва, Расейская Дэлегацыя адносіцца амаль што варожа. З'ехаўшыяся ў Менску кажушныя дэлегаты беларускіх мужыкоў былі названы паважаным Старшынёй Расейскай Дэлегацыі памешчыкамі. Памешчыкі у Беларусі—гэта палякі,—яны даўно акрэсьліліся да Польшчы. Вымагаць незалежнасьці краю, каб аддаць уладу мужыцкаму беларускаму народу, не ляжьщь у інтарэсах ні польскіх ні нават беларускіх памешчыкаў; наадварот, у інтарэсах іх было цягнуць да шляхецкай Польшчы і да магутнай тады імпэрскай Гэрманіі.

Тэлеграма ад 24 сакавіка 1918 г., аб якой гаворыць Расейская Дэлегацыя, паколькі яна была запраўды выслана, адносіцца да так званага „прэдстаўніцтва"; што такая тэлеграма была састаўлена „прэдстаўніцтвам", гэта мне ведама, і калі гэты гурток з п. Аляксюком на чале выяўляе цяпер у часе польскай акупацыі польскую арыентацыю, дык пэўна-ж гэты самы гурток у выпадку акупацыі Беларусі Савецкай Расеяй будзе выяўляць расейскую арыентацыю. Гэтым сваім параўнаньнем я не хачу абразіць тут прысутнага прэдстаўніка трэйцяга гуртка, які я хачу верыць, па ідэйным сваім пераконаньням прытрымовываецца арыентацыі астаўленьня Беларусі ў межах Савецкай Рэспублікі. Магчыма, што будучы заўсёды пад уплывам Расеі, частка Беларусі Арлоўскай, Смаленскай і Магілеўскай губэрняў, дзе яшчэ самаадзначэньне, дзякуючы русыфікацыі, не асабліва вялікае, і акрэсьліваецца ў бок Савецкай Расеі, але Городзенскія землі ні нават Менская губэрня ніколі да ўсходу не цягнулі, а, наадварот, знаходзячыся пад уплывам Захаду, і сягоньня цягнуць да Балтыцкага мора. Калі-б прэдстаўнікі Расеі тут гаварылі аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, дык тагды беларуска-літоўскае саглашэньне магло-б належаць некатораму абсуджэньню, але тут размова ідзе аб далучэньні Беларусі да Савецкай Расеі. Гурток, стаячы за прылучэньне Беларусі да Савецкай Расеі, з'яўляецца для нас самазваным, тым болей, што нам вядомы многія факты паўстаньняў беларускіх сялян у часе савецкай акупацыі, рабочага-ж классу, склоннага да бальшавізму, за атсутнасьцю фабрык, на Беларусі няма.

Канчаючы сваю прамову, я хочу зьвернуць увагу ўсяго сьвету, што ніколі ня будзе міру, калі хоць адзін кавалак Беларусі будзе знаходзіцца ў руках Польшчы ці Расеі.

ТЭЛЕГРАМЫ.

КОЎНА, 29 XI. (Эльта). Як паведамляе Беларускае Прэс-Бюро, Урад Б. Н. Р. паслаў сваіх предстаўнікаў у Англію, Гіппанію і Юго-Славію.

* * *

КОЎНА, 29 XI. (Эльта). Па весткам тагож Бюро, Менскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт прыступіў да арганізацыі беларускага войска.

* * *

КОЎНА, 29 XI. (Эльта). У зьвязку з пастановай Лігі Народаў на Жэнэйскай Канфэрэнцыі развязаць Літоўска-Польскі канфлікт плебісцытам, Урад Б. Н. Р., як заінтэрасаваны ў гэтым пытаньні, 26 лістапада паслаў сваіх предстаўнікаў у Жэнэву.

* * *

КОЎНА, XII. 3 (Эльта). Як паведамляе Беларускае Прэс-Бюро, польскія газэты ў апошнія часы перадаюць тэндэнцыозныя весткі аб паўстаньнях на Беларусі, а іменна, быццам беларускія партызаны вядуць барацьбу з савецкімі войскамі, а польскай акупацыі сачуўствуюць.

Беларускія партызаны, лік каторых у апошні час значна павелічыўся і дасягае некалькіх тысячаў добра арганізаваных салдатаў, каторыя вядуць барацьбу ня толькі з Масквой, але і з польскімі акупантамі. Яны змагаюцца пад лозунгам: Непадзельная і незалежная Беларуская Народная Рэспубліка.

Польскі урад некалькі раз прапанаваў беларускім партызанам сваю дапамогу, але гэтыя прапановы заўсёды былі адкідаемы.

Цяпер партызаны вядуць моцныя апэрацыі ў тылу войск Жэлігоўскага ў раёне м. Радашковічы: 3000 добра ваaружаных жаўнерай нанясьлі вялікія страты польскай рэгулярнай арміі.

* * *

Па весткам газэты „Litwa" на чыгунковай станцыі Солы заарэштован беларускі афіцэр Сяргей Канапелько, які па даручэньню Беларускай Вайсковай Камісіі вербаваў самаахвотнікаў да беларускага войска.

Рэдакцыя: Стол Друку Міністэрства Беларускіх Спраў. Коўна, вуліца Адама Міцкевіча, 13а.

ДРУКАРНЯ А. БАКА і Х. МАНКЕС, КОЎНА.